РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЛЮТАГА 2025 г. СУБОТА № 27 (30415)

БЕЛАРУСЬ — БАШКАРТАСТАН: СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

Учора ў Палацы Незалежнасці другі раз за рабочы тыдзень прымалі губернатара расійскага рэгіёна. Гэтым разам — кіраўніка Башкартастана. Мінск і Уфа ўжо маюць узаемавыгадныя тэхналагічныя сумесныя праекты, значны тавараабарот. Але рэзервы на рост ёсць, адзначыў Прэзідэнт Беларусі, іх можна і патрэбна выкарыстоўваць.

(Працяг на 2–3-й стар.)

СПАЖЫВЕЦ

ШТО ПАСЕЕМ?

Як не памыліцца з выбарам

Якаснае насенне — найважнейшая ўмова будучага ўраджаю і ў прамысловых маштабах, і на асабістых градках. Ад пасяўнога матэрыялу ўвесну будзе залежаць настрой гаспадароў напрыканцы лета, калі прыйдзе час «жніва».

Ужо сёння агароднікі-аматары рыхтуюцца да пасяўной. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова наведаць любую краму «Насенне». Пакупнікоў шмат, асартымент вялікі, цэны — розныя. Ну а мы загадзя спыталі ў навукоўцаў, як аматару не памыліцца з выбарам пасяўнога матэрыялу.

СТАР. 10

СЛЫННЫЯ ЮБІЛЯРЫ КУПАЛАЎСКАГА

9

У НАГУ З ЧАСАМ

АЙЦІШНІКІ Ў ПАГОНАХ

Як функцыянуе самае інтэлектуальнае падраздзяленне Узброеных Сіл

Конкурс у роту інфармацыйных тэхналогій — як на самыя прэстыжныя спецыяльнасці вядучых ВНУ краіны: каля 40 чалавек на месца. Атрымліваючы павестку на тэрміновую ваенную службу, камп'ютарныя геніі ўсе як адзін мараць трапіць сюды. Яны ведаюць: у падраздзяленні не тое што не страцяць свае прафесійныя кампетэнцыі, а, наадварот, удасканаляць свае веды, выйдуць на новы ўзровень, які дазволіць быць больш канкурэнтаздольнымі на рынку працы.

СТАР. 8

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

«НАМ З ВАМІ КАМФОРТНА І ВЕЛЬМІ

Чаму Башкартастан — перспектыўны партнёр

Інтэграцыйныя пытанні на гэтым тыдні трывала замацаваліся ў парадку дня кіраўніка дзяржавы. У панядзелак на найвышэйшым узроўні з губернатарам Хабараўскага краю разглядалі, як Далёкі Усход зрабіць блізкім. А ў пятніцу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Рэспублікі Башкартастан Радзіем Хабіравым.

Фота БелТА.

Гэта не першы візіт дэлегацыі Башкартастана ў Беларусь. Таму, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, госці ўжо знаёмыя з магчымасцямі нашай краіны. «У нас нядрэнныя адносіны. Мы маем шэраг тэхналагічных праектаў. Але, шчыра кажучы, мы крыху збавілі абароты ў мінулым годзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У студзені — лістападзе 2024 года тавараабарот паміж Беларуссю і Башкартастанам склаў 311,5 мільёна долараў. А ў 2023 годзе — 364 мільёны. Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў 2025-м неабходна перавысіць мінулагодні тавараабарот.

«ТЭХНІКА БУДЗЕ ПАТРЭБНА ЗАЎСЁДЫ»

«Нашы магчымасці вы добра ведаеце. Нам з вамі камфортна і вельмі выгадна супрацоўнічаць, таму што ваша рэспубліка — гэта еўрапейскі цэнтр Расійскай Федэрацыі, найбольш прасунуты, развіты. Таму нам выгадна супрацоўнічаць з вамі і разам працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ўжо наладжана эфектыўнае супрацоўніцтва ў вытворчасці трактароў. «Гэта не дабрачыннасць ні ў якім разе з нашага боку. Для нас гэта надзвычай выгадны варыянт супрацоўніцтва», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што беларускі бок гатовы супрацоўнічаць па ўсіх кірунках, асабліва ў машынабудаванні. МАЗ і Уфімскі трамвайна-тралейбусны завод ужо наладзілі сумесную вытворчасць тралейбусаў, якія паспяхова прадаюцца ў іншыя рэгіёны Расіі. Аляксандр Лукашэнка прывёў лічбы: калі ў 2020—2021 гадах выраблялася да 60 тралейбусаў, то ў 2023—2024-м — больш як 300 тралейбусаў за год. «Гэта добрыя тэмпы. І думаю, што нам трэба развіваць гэты кірунак супрацоўніцтва», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, варта наладзіць супрацоўніцтва і ў вытворчасці трамваяў. Беларускі бок да гэтага цалкам гатовы.

> **«Тэхніка будзе патрэбна заўсёды. Асабліва для вялізнай Расіі, — сказаў ён. — Мы гатовы цалкам задаволіць попыт на гэту тэхніку і разам працаваць спачатку па зборцы, а потым па сумеснай вытворчасці тэхнікі, падобнай на «Амкадор» па тэхналогіях».**

Асобна Прэзідэнт вылучыў адкрыццё ва Уфе сэрвіснага цэнтра па вытворчасці тэхнікі «Амкадор». «Тэхніка будзе патрэбна заўсёды. Асабліва для вялізнай Расіі, — сказаў ён. — Мы гатовы цалкам задаволіць попыт на гэту тэхніку і разам працаваць спачатку па зборцы, а потым па вытворчасці тэхнікі, падобнай на «Амкадор» па тэхналогіях».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Башкартастан выдатна працуе ў харчовай прамысловасці. Але тым не менш пры неабходнасці беларускі бок гатовы супрацоўнічаць і ў гэтай сферы. Тое ж самае і па лёгкай прамысловасці. «Усё, што трэба чалавеку з адзення ды абутку, мы ўмеем рабіць. Нават калі будуць патрэбны не толькі нашы тавары, але і тэхналогіі потым падыдуць, з вялікім задавальненнем будзем працаваць», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

Перспектыўным кірункам, па меркаванні беларускага лідара, з'яўляецца вытворчасць беспілотных лятальных апаратаў для аграпрамысловага комплексу. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беспілотнікі сёння вельмі запатрабаваныя, і не толькі ў АПК. «Досвед ёсць, напрацоўкі пэўныя ёсць. Рынак сёння добры. Думаю, што трэба рухацца ў гэтым кірунку», — сказаў ён.

> **Перспектыўным кірункам, па меркаванні беларускага лідара, з'яўляецца вытворчасць беспілотных лятальных апаратаў для аграпрамысловага комплексу. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беспілотнікі сёння вельмі запатрабаваныя, і не толькі ў АПК. «Досвед ёсць, напрацоўкі пэўныя ёсць. Рынак сёння добры. Думаю, што трэба рухацца ў гэтым кірунку», — сказаў ён.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што супрацоўніцтва можна развіваць па розных кірунках, паколькі Башкартастан сёння вельмі важны для Беларусі рэгіён. «Калі мы дамовімся па нейкіх пытаннях, не сумнявайцеся, мы абавязкова выканаем свае абавязацельствы», — запэўніў ён.

«ДЛЯ НАС БЕЛАРУСЬ — НЕ ПРОСТА ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНЫ ПАРТНЁР. ГЭТА НАША БРАЦКАЯ РЭСПУБЛІКА»

У сваю чаргу Радзій Хабіраў падзякаваў беларускім партнёрам за цёплы прыём. Кіраўнік

> **Нам выгадна супрацоўнічаць з вамі і разам працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што ўжо наладжана эфектыўнае супрацоўніцтва ў вытворчасці трактароў. «Гэта не дабрачыннасць ні ў якім разе з нашага боку. Для нас гэта надзвычай выгадны варыянт супрацоўніцтва», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

ВЫГАДНА СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ» для Беларусі

Рэспублікі Башкартастан павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах. «Мы лічым, што гэта вельмі важная падзея для нашых дзяржаў. Мы ад душы вас віншуем, — сказаў ён. — Для нас Беларусь — не проста знешнеэканамічны партнёр. Гэта наша брацкая рэспубліка, інакш мы нашых братоў-беларусаў не разглядаем».

Папярэдняя сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Радзія Хабірава адбылася ў 2021 годзе. Па словах кіраўніка Башкартастана, увесь гэты час праводзілася вялікая работа. Ён адзначыў, што яго рэспубліка вельмі зацікаўлена ў беларускай тэхніцы і актыўна яе закупае. Асаблівай папулярнасцю ў Башкартастане карыстаецца тэхніка МАЗ. «Мы будзем знаходзіць новыя пункты збыту. Ёсць напрацоўкі ў галіне нафтахіміі. Беларускія прадукты харчавання заваявалі сімпатыі нашых жыхароў. І мы будзем працягваць гэту работу», — сказаў Радзій Хабіраў.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

На чале ўсяго — глыбокая прамысловая кааперацыя

У размове з журналістамі **кіраўнік Рэспублікі Башкартастан Радзій ХАБІРАЎ** назваў сустрэчу з кіраўніком дзяржавы вельмі плённай. «Безумоўна, мы ўсе зацікаўлены ў росце тавараабароту. Аляксандр Рыгоравіч звярнуў увагу, што ў нас летась было невялікае падзенне, але падзенне менавіта экспарту башкірскага, імпарт башкірскі, наадварот, павялічваўся, і гэта вельмі добра. Мы абмеркавалі пытанні пастаўкі тэхнікі: камунальнай, машынабудаўнічай, сельскагаспадарчай ды іншай. Аляксандр Рыгоравіч прапанаваў развіваць сетку сэрвісных цэнтраў, таму што тэхнікі ўжо шмат, яе трэба ўтрымліваць і абслугоўваць. На чале ўсяго — глыбокая прамысловая кааперацыя па шэрагу пэўных прадпрыемстваў, з якімі мы цяпер ствараем сумесныя вытворчасці», — сказаў ён.

> **Башкірскі бок выступіў з ідэяй стварыць башкірска-беларускі інвестыцыйны кластар. Гэта новая эканамічная з'ява. І Прэзідэнт Беларусі гэту ідэю падтрымаў. «Мы вызначылі тэрыторыю з пэўным статусам, дзе будуць розныя прэферэнцыі для вытворцаў. Напрыклад, ільготы па ўтыльзборы, гэта значыць, прэферэнцый больш, чым у традыцыйнай свабоднай эканамічнай зоне, якія ёсць у Расіі. Тэрыторыя такая, што там могуць размясціцца пяць тэхнапаркаў. Для таго каб людзі там працавалі, мы нават думалі аб будаўніцтве арэнднага жылля. Але паколькі гэта прапанова з удзелам замежнага прадстаўніка, трэба перагледзець федэральнае заканадаўства, чым і займаемся», — раскрыў некаторыя падрабязнасці Радзій Хабіраў.**

Па яго словах, у беларуска-башкірскім супрацоўніцтве вельмі шырокі спектр пытанняў не толькі эканамічных, але і сацыяльных, культурных, гуманітарных, навуковых. «Мы вельмі хочам адкрыць для жыхароў нашай рэспублікі турыстычныя магчымасці Беларусі. Дзейнічае праграма «Башкірска-беларускае даўгалецце», па якой мы адпраўляем сюды нашых ветэранаў на адпачынак і аздараўленне. За тры гады больш як тры тысячы нашых ветэранаў наведалі Беларусь. І мы былі б вельмі рады, каб беларусы да нас прыязджалі. Мы пачалі маштабны навуковы праект — узнаўленне статка зуброў. Мы набылі ў Беларусі 18 жывёлін, цяпер у нас іх 23, пяцёра цялят нарадзілася ўжо ў Башкартастане. Гэта знакавы сімвалічны момант у нашым супрацоўніцтве», — расказаў Радзій Хабіраў.

Тым часам

СПЫНЯЦЦА НЕЛЬГА, І ЎСЁ АТРЫМАЕЦЦА

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА правёў рабочую сустрэчу з кіраўніком Рэспублікі Башкартастан Радзіем Хабіравым, якая прайшла ў Доме ўрада.

Бакі абмеркавалі вынікі раней дасягнутых дамоўленасцяў і пазначылі перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва.

Раман Галоўчанка адзначыў, што 2024 год завяршыўся з некаторым зніжэннем тавараабароту, якое не з'яўляецца крытычным, але яго неабходна пераадолець:

— Я разлічваю, што наш дзеючы інструмент — сумесная рабочая група па супрацоўніцтве, якая актыўна падключыцца да вырашэння гэтага пытання.

Прэм'ер-міністр канстатаваў, што базіс гандлёва-эканамічных адносін — супрацоўніцтва ў сферы вытворчай кааперацыі. У якасці паспяховага прыкладу ён прывёў праект МАЗа і Уфімскага трамвайна-тралейбуснага завода:

— Калі ў 2020—2022 гады былі дзясяткі адзінак выпушчанай прадукцыі, то ўжо ў 2023—2024 гадах гэта колькасць склала 238 і 307 тралейбусаў адпаведна. Радуе, што гэта прадукцыя заняла сваё месца не толькі ў пасажырскіх перавозках у Башкартастане, але і ў многіх іншых гарадах Расійскай Федэрацыі. Трэба прымаць меры па далейшым пашырэнні. Я лічу, што прадпрыемства мае перспектывы стаць вядучым вытворцам у Расійскай Федэрацыі.

Агучыў ён і перспектывы ўзаемадзеяння ў абнаўленні трамвайнага парка Башкартастана з удзелам беларускага прадпрыемства «Белкамунмаш», супрацоўніцтва з Мінскім заводам колавых цягачоў, холдынгам «Белаўтадар», павелічэння паставак сельскагаспадарчай прадукцыі і праектаў з беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыяй. Адзначыў і шэраг прапаноў па сельгасмашынабудаванні і абсталяванні для малочнатаварных ферм.

— Разумеем, што цяпер не вельмі простая абстаноўка з пункту гледжання інвестыцый. У цэлым Расійская Федэрацыя звязана з многімі фактарамі, у тым ліку з досыць дарагімі крэдытнымі рэсурсамі, што стрымлівае закупкі. Аднак мы маем варыянты вырашэння гэтай праблемы, — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Ён растлумачыў, што дзякуючы настойлівай рабоце ўрадаў Беларусі і Расіі па даручэнні прэзідэнтаў (даручэнне датычылася рэалізацыі Дэкрэта аб узаемным прызнанні тэхналагічных аперацый), у снежні 2024 года была прынята пастанова Урада Расійскай Федэрацыі, якая дае нацыянальны рэжым закупак для беларускіх тавараў:

— Адпаведна, няма ніякіх праблем, якія абмяжоўваюць магчымасці закупкі беларускіх тавараў, у тым ліку за кошт бюджэтных сродкаў або праграм дзяржаўнай падтрымкі. Таму ўся лінейка беларускага абсталявання можа закупляцца ў рамках такіх праграм.

Акрамя гэтага, Раман Галоўчанка агучыў і іншыя мадэлі фінансавай падтрымкі для расійскіх пакупнікоў, якія прадстаўляюцца беларускім бокам.

Ён выказаў упэўненасць, што кіраўнік Башкартастана даручыць адпаведным службам уважліва вывучыць прапановы і выбраць той парадак, які найбольш падышоў бы для рэспублікі.

— Спыняцца нельга. Ёсць дакладныя даручэнні кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, як і нашага Прэзідэнта, па тым, што якасць жыцця людзей не тое што не павінна зніжацца — павінна прырастаць, нягледзячы на ўсе (санкцыйныя. — **Заўв. аўт.**) умовы, — сказаў на заканчэнне ён.

НА КАНТРОЛІ

ПРАМЫСЛОВЫЯ АКЦЭНТЫ

Старшыня Савета Рэспублікі з рабочым візітам наведала Віцебскую вобласць

Наталля КАЧАНАВА азнаёмілася з дзейнасцю вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Мёрскі мясакамбінат» і ААТ «Полацкі малочны камбінат», сустрэлася з працоўнымі калектывамі і кіраўніцтвам.

Як даверaная асоба кіраўніка дзяржавы на мінулых прэзідэнцкіх выбарах Старшыня Савета Рэспублікі выказала словы падзякі працаўнікам Мёрскага МК за актыўны ўдзел у электаральнай кампаніі. Яна таксама звярнула ўвагу членаў калектыву на тое, што іх прадпрыемства працуе эфектыўна, таму рэарганізоўваць і далучаць да іншых суб'ектаў гаспадарання камбінат не будуць. «Па шматлікіх просьбах абласныя «Дажынкі-2025» вырашана правесці ў Мёрах. А гэта значыць, што горад стане яшчэ прыгажэйшым і больш камфортным для жыцця», — сказала Наталля Качанава.

Мёрскі мясакамбінат сёлета адзначае 60-годдзе з дня ўтварэння. Прадпрыемства паспяхова вырабляе і рэалізоўвае больш за 200 найменняў каўбасных вырабаў і вэнджаніны. Сыравіну для прадукцыі камбінат закупляе тут жа, на Віцебшчыне. Дзякуючы пастаяннай мадэрнізацыі вытворчасці якасная мясная прадукцыя рэалізоўваецца не толькі па Беларусі, але ідзе і на экспарт.

На нарадзе з кіраўніцтвам Полацкага малочнага камбіната Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што падчас сустрэч з працоўнымі калектывамі ў рамках электаральнай кампаніі ў некаторых былі агучаны праблемныя моманты, якія кіраўнік дзяржавы даручыў узяць на кантроль да іх поўнага вырашэння. У ліку прадпрыемстваў, дзе працаўнікі гаварылі аб жаданні палепшыць вытворчасць, быў і Полацкі малочны камбінат.

ПМК — найбуйнейшае прадпрыемства ў паўночным рэгіёне, якое займаецца вытворчасцю малочнай прадукцыі, сухога малака і масла. Не толькі беларусам, але і замежным пакупнікам добра вядома прадукцыя камбіната пад маркамі «Сафійка», «Палачанка», «Малочнае раздолле».

«Гэта прадпрыемства добра сябе зарэкамендавала ў тым плане, што яго прадукцыя вядомая не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. У яго добрая гісторыя, тут сфарміраваўся моцны калектыў, людзі па-добраму ставяцца да свайго прадпрыемства і хочуць яго захаваць. Мы павінны выпрацаваць канструктыўныя рашэнні для далейшага даклада кіраўніку краіны», — заключыла Наталля Качанава.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота БелТА.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

УЗМАЦНЕННЕ І ПАВЫШЭННЕ

У першым чытанні на сесіі Палаты прадстаўнікоў разгледжаны законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей», якім узмацняюцца гарантыі дзяржаўнай абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей. Акрамя таго, істотныя змяненні чакаюцца ў сферы рэгулявання аўдытарскай дзейнасці. Аднак перш чым прыступіць да абмеркавання вынесеных на разгляд дэпутатаў законапраектаў, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА агучыў перад парламентарыямі шэраг задач. Асноўны пасыл — дэпутацкі корпус павінен актыўна падключыцца да інфармавання грамадскасці яшчэ на этапе распрацоўкі заканадаўчых ініцыятыў.

АЎТАРСКІ ПАДЫХОД, МІЖНАРОДНЫ ПАРАДАК ДНЯ І ВЫКАНАЛЬНІЦКАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Спікер праінфармаваў, што пастаянныя камісіі аператыўна замацавалі дэпутатаў, адказных за падрыхтоўку законапраектаў, уключаных у зацверджаны кіраўніком дзяржавы план падрыхтоўкі на 2025 год. Па яго словах, упаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі пачата фарміраванне міжведамасных рабочых груп па распрацоўцы законапраектаў, у якія ўвайшлі і дэпутаты, і работнікі сакратарыята Палаты прадстаўнікоў.

«Упэўнены, што інфармацыя ў сродках масавай інфармацыі аб ходзе падрыхтоўкі законапраектаў да іх унясення ў Палату прадстаўнікоў будзе вельмі цікавая не толькі выбаршчыкам, але і правапрымяняльнікам, — адзначыў Ігар Сергяенка. — Дэпутаты павінны актыўна падключыцца да інфармавання грамадскасці аб ходзе падрыхтоўкі планавых законапраектаў».

Пры гэтым Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што, у адпаведнасці з Канстытуцыяй, кожны дэпутат з'яўляецца суб'ектам права заканадаўчай ініцыятывы. Гэта прадугледжвае ініцыятыўную работу па падрыхтоўцы аўтарскіх праектаў з узгадненнем іх з зацікаўленымі і ўнясеннем у Палату прадстаўнікоў. Спікер падкрэсліў, што чакае ад дэпутатаў канкрэтных прапаноў па пераліку ініцыятыўных законапраектаў, якія ідуць ад зямлі, для арганізацыі работы па іх падрыхтоўцы ў профільных камісіях, а таксама па планаванні

Навіна аб тым, што ўжо ў наступным месяцы можа быць падпісаны ўказ кіраўніка дзяржавы аб паўнамоцтвах і кампетэнцыях кіраўнікоў базавых выканкамаў, стала без перабольшвання рэзананснай. Гэта тэма ўжо неаднойчы абмяркоўвалася, нават на ўзроўні Усебеларускага народнага сходу. У чацвер на адпаведнай нарадзе Прэзідэнт расставіў усе акцэнты, галоўныя з якіх: гэта патрэбна для нармальнага функцыянавання і развіцця інстытута дзяржавы, кіраўнік рай- або гарвыканкама павінен быць на сваёй тэрыторыі гаспадаром, з якога строга пытаюць, але які мае права гэтаксама строга спытаць з іншых. «Рашэнні выканаўчага камітэта і старшыні выканкама павінны быць канчатковымі, абмеркаванню не падлягаць. У плане функцыяналу, які кладзецца на іх», — катэгарычна заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паразважаць аб тым, што дасць размеркаванне і канкрэтызацыя паўнамоцтваў старшынь базавых выканкамаў, мы прапанавалі членам Савета Рэспублікі, які з'яўляецца органам тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, а таксама галоўным суб'ектам будучага ўказа — кіраўнікам мясцовай вертыкалі.

АКЦЭНТЫ

КАБ ЭФЕКТЫЎНА ВЫРАШАЦЬ

«РАЗМЕРКАВАННЕ ПАЎНАМОЦТВАЎ — ПРЫКЛАД САПРАЎДНАЙ ДЭМАКРАТЫІ»



Так лічыць **член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА.**

— Гэта чарговае пацвярджэнне таго, што мы жывём у па-сапраўднаму дэмакратычнай краіне, дзе існуе сапраўднае народаўладдзе і найважнейшыя пытанні вырашаюцца калегіяльна, — падкрэслівае яна. — У нашай гісторыі быў перыяд, калі для таго, каб адвесці краіну ад бездані, патрабавалася жорсткая канцэнтрацыя ўлады. Але дзякуючы волі і настойлівасці кіраўніка дзяржавы мы яго шчасліва абмінулі. Надышоў час больш шырока дэлегаваць уладныя паўнамоцтвы на месцы. Што асабліва важна ў аб'яўлены Год добраўпарадкавання, якое мае на ўвазе не толькі і не столькі навядзенне чысціні і парадку, але і вырашэнне больш значных задач. У тым ліку і прадпрыемствамі прыватнай формы ўласнасці. Ведаю, што многія з іх ахвотна падтрымліваюць усе мерапрыемствы мясцовай улады, ахвотна ідуць на кантакт. Больш за тое, самі нярэдка выступаюць ініцыятарамі тых ці іншых грамадска карысных і значных мерапрыемстваў. Але ёсць і тыя, хто не да канца ўсведамляе сваю долю сацыяльнай адказнасці, хто лічыць за лепшае трымацца ўбаку ад грамадскага жыцця, нават суботнікі, якія праводзяцца, ігнаруе. Павышэнне ролі старшынь гар-, райвыканкамаў, надзяленне іх дадатковымі паўнамоцтвамі якраз і неабходна для таго, каб аператыўна, на месцы вырашаць усе пытанні.

«ГЭТА СВОЕЧАСОВА І НЕАБХОДНА»

Так ахарактарызаваў меркаванае рашэнне аб павышэнні статусу старшынь выканкамаў **член Савета Рэспублікі, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр ГАРОШКІН.**

— У Рэспубліцы Беларусь створана і функцыянуе вертыкаль улады, якая вынікамі і паказчыкамі даказвае сваю эфектыўнасць. Але Прэзідэнт Рэспублікі неаднойчы падкрэсліваў, што, зыходзячы з узроўняў патрабаванняў і задач, якія стаяць перад кіраўнікамі гар(рай)выканкамаў, дзе яны павінны быць прэзідэнтамі на сваіх тэрыторыях, ім патрэбны і адпаведныя паўнамоцтвы, — адзначыў кіраўнік дэпутацкага корпуса Магілёўшчыны. — Упэўнены, што ўзнятыя на нарадзе пытанні аб павышэнні статусу старшынь базавага ўзроўню своечасовыя і неабходныя. Для істотнага паляпшэння якаснага ўзроўню жыцця людзей у раёнах і гарадах паўнамоцтвы кіраўнікоў павінны ў поўным аб'ёме распаўсюджвацца на ўсе прадпрыемствы і арганізацыі, якія знаходзяцца на падведамнай тэрыторыі, нягледзячы на формы іх уласнасці і прыналежнасці. Старшыні гар-, райвыканкамаў павінны мець законную магчымасць прымаць адказныя рашэнні, якія падлягаюць няўхільнаму выкананню ўсімі суб'ектамі, і несці поўную адказнасць за іх рэалізацыю.

«НОВЫЯ ПАЎНАМОЦТВЫ ВЕРТЫКАЛІ — НА КАРЫСЦЬ ДЗЯРЖАВЕ»

Старшыня Свіслацкага райвыканкама Андрэй ГРЫЦКЕВІЧ лічыць прававое рэгуляванне паўнамоцтваў старшынь выканкамаў

АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ ЯКАСЦІ АЎДЫТАРСКІХ ПАСЛУГ

Дэпутаты прынялі заканадаўчыя рашэнні

Будзе разгледжана пытанне аб наданні парламенту Рэспублікі Беларусь статусу назіральніка ў гэтай міжнароднай арганізацыі. У гэтым месяцы дэлегацыя Палаты прадстаўнікоў плануе прыняць удзел і ў 24-м зімовым пасяджэнні Парламенцкай асамблеі АБСЕ, у пасяджэннях камісій Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Ігар Сергяенка нагадаў, што напярэдадні з удзелам кіраўніка дзяржавы адбылася нарада па пытаннях удасканалення прававога рэгулявання статусу старшыні выканкама базавага ўзроўню. «У ходзе нарады Прэзідэнтам чарговы раз указана на неабходнасць павышэння ўзроўню выканальніцкай дысцыпліны ў краіне і выключэнне недапрацовак у гэтым плане. Таму звяртаю ўвагу ўсіх дзяржслужачых, у тым ліку дэпутатаў, на забеспячэнне на кожным рабочым месцы жорсткай і безумоўнай выканальніцкай дысцыпліны».

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЛЕКАМІ І АБАРОНА АД НЕГАТЫЎНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей» перш за ўсё вызначае статус дзіцяці і накіраваны на ахову яго здароўя, звярнула ўвагу **член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Святлана АДЗІНЦОВА**, якая прадстаўляла дакумент. «Асаблівы клопат і сацыяльная абарона гарантуецца дзецям-інвалідам, дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, а таксама дзецям, якія засталіся без сямейнага атачэння, — канкрэтызавала яна. — Дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, будуць забяспечвацца лекавымі сродкамі, медыцынскімі вырабамі, у тым ліку акулярамі, за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэту».

Прадугледжана праходжанне псіхалагічнага тэсціравання асоб, якія прэтэндуюць на ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці. «Мы мяркуем, што гэта норма ў першую чаргу будзе датычыцца тых асоб, якія будуць прымацца на работу. Для таго, каб кіраўнікі ўстаноў адукацыі, культуры, спорту былі ўпэўнены ў тым, што гэтыя работнікі цалкам усведамляюць адказнасць работы з дзецьмі», — удакладніў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.**

Па словах Андрэя Іванца, будзе дзейнічаць забарона на педагагічную дзейнасць асоб, якія прыцягваліся да крымінальнай адказнасці за экстрэмісцкую дзейнасць, распаўсюджванне наркатычных і псіхатропных сродкаў, іх прэкурсораў або аналагаў. На інфармацыйную прадукцыю і цацкі, якія могуць нанесці шкоду здароўю дзяцей, прапагандуюць гвалт, забойства і жорсткасць, будзе накладвацца знак узроставага абмежавання.

БЕЗДАКОРНАЯ РЭПУТАЦЫЯ І АБАРОНА КАРЫСТАЛЬНІКАЎ

Законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўдыторскай дзейнасці», прыняты ў першым чытанні, удакладняе пералік правапарушэнняў, а таксама злачынстваў, наяўнасць судзімасцяў за здзяйсненне якіх не дазваляе аўдытару ўдзельнічаць у ажыццяўленні аўдыторскай дзейнасці. Прапаноўваецца замацаваць патрабаванне аб правядзенні ў 2025 годзе пераатэстацыі аўдытараў, якіх, дарэчы, у рэестры налічваецца каля 1100.

Член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Вольга ЖУК агучыла падрабязнасці змяненняў, што прапаноўваюцца: «Уводзіцца да аўдытараў такое патрабаванне, як наяўнасць бездакорнай прафесійнай дзелавой рэпутацыі, — дадала парламентарый. — У законапраекце раскрываецца паняцце гэтага патрабавання. Гэта ў тым ліку адсутнасць непагашанай судзімасці па шэрагу падстаў, якія прадугледжаны ў праекце, адсутнасць на працягу двух папярэдніх гадоў адміністрацыйных правапарушэнняў па пераліку, які будзе вызначацца Міністэрствам фінансаў».

Дэпутатамі таксама ратыфікаваны Пратакол аб унясенні змяненняў у Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб агульных прынцыпах падаткаабкладання па ўскосных падатках ад 3 кастрычніка 2022 года, а таксама Канвенцыі аб прававым статусе дэлегацый, што накіроўваюцца ў дзяржавы — удзельніцы СНД.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

ПЫТАННІ НА МЕСЦАХ

мерай своечасовай. Асабліва ва ўмовах знешнеэканамічнай сітуацыі, якая склалася. У сувязі з гэтым перад мясцовымі ўладамі ставяцца сур'ёзныя задачы. Адна з галоўных — нарошчваць тэмпы развіцця. Гэта датычыць і планаў у сельскай гаспадарцы і фінансава-эканамічнай сферы ў цэлым. А вось рычагі да апошняга часу заставаліся ранейшымі.

Часам для вырашэння дробных пытанняў даводзіцца задзейнічаць шмат вышэйшых інстанцый. Напрыклад, каб адкрыць кар'ер па здабычы жвіру для будаўніцтва. Між тым час ідзе, будоўля зацягваецца. Калі гэта будуць вырашаць выканкамы, справа пойдзе хутчэй.

Рашэнне па прававым рэгуляванні паўнамоцтваў, на думку старшыні, дазволіць распараджацца рэшткамі сродкаў, што сведчыць аб даверы мясцовым органам улады, якія могуць накіраваць іх на патрэбныя мэты. Дзесьці гэта звязана з добраўпарадкаваннем, дзесьці — з капітальным рамонтам сацыяльных аб'ектаў. У сваю чаргу, людзі будуць бачыць, што ўлада хутка рэагуе на іх пытанні, аператыўна іх вырашае, што будзе садзейнічаць аўтарытэту вертыкалі.

Старшыня райвыканкама заўважае таксама, што ўлада павінна быць адзінай для ўсіх, у тым ліку для прыватнай сферы дзейнасці. Бывае, фермеры заяўляюць, што атрымліваюць мала падтрымкі. «Калі ўзяць па аб'ёме вытворчасці, ім яшчэ далёка да камунальных прадпрыемстваў — гэта несупастаўныя аб'ёмы. А мы за іх таксама адказваем. Таму лічу, што ўлады могуць даводзіць ім таксама заданні, яны павінны ісці ў адным рытме з усёй краінай, а не быць у нейкім асобным гурце. Орган улады павінен быць адзіным для ўсіх, бо гэта адназначна пойдзе на карысць дзяржаве», — упэўнены Андрэй Грыцкевіч.

«НОРМА ПАДШТУРХНЕ ДА БОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНАЙ ПРАЦЫ»

Такую думку выказала **старшыня Гарадоцкага райвыканкама Ірына ПАЛЯКОВА.**

«Важна, што цяпер выканкам будзе мець права ўносіць пэўныя змяненні, перакідваць адпаведныя рэсурсы ў залежнасці ад сітуацыі па даходнай і расходнай частках гадавога ліміту раённага бюджэту, — сказала яна. — Яшчэ адна перавага — магчымасць распараджацца рэшткамі сродкаў адпаведнага бюджэту. Такая стымуляцыйная норма і мера будзе падштурхоўваць раёны працаваць яшчэ больш эфектыўна і дасягаць высокіх вынікаў».

Права старшыні райвыканкама ўзгадняць кіраўнікоў тэрытарыяльных органаў усіх міністэрстваў і ведамстваў, кіраўнікоў ключавых арганізацый раёна ўсіх формаў уласнасці па пераліку, які зацвердзіць сам выканкам, — гэта выдатны інструмент для фарміравання моцнага кадравага блока раёна, упэўнена старшыня райвыканкама.

«Менавіта старшыня на месцы ведае лепш, які спецыяліст патрэбны той ці іншай арганізацыі. Агульнае разуменне пастаўленых мэт і планаў, сумесная распрацоўка плана развіцця — гэта аснова паспяховага функцыянавання ўсіх сфер раёна, — лічыць Ірына Палякова. — Прэзідэнт адзначыў, што павышэнне статусу старшыняў выканкамаў базавага ўзроўню — гэта і шматразовае ўзмацненне адказнасці за развіццё горада і раёна. І гэта правільна, на такім прынцыпе і павінна грунтавацца наша работа. Толькі так мы зможам атрымаць большы вынік і апраўдаць чаканні нашых людзей».

«ЗА РЭГІЁН АДКАЗНЫЯ ЎСЕ, ХТО ПРАЦУЕ НА ЯГО ТЭРЫТОРЫІ»

Перакананы **старшыня Быхаўскага райвыканкама Аляксандр КІСЯЛЁЎ.**

«Бюджэт Быхаўскага раёна амаль на 40 % забяспечваюць прыватныя структуры, — паведаміў ён. — Дадатковыя паўнамоцтвы дадуць магчымасць выканаўчай уладзе больш уключаць прыватны бізнес у развіццё раёна і рэспублікі, у добраўпарадкаванне тэрыторый. Шэраг прыватнікаў маюць спажывецкі погляд на будынкі, якія выкупілі. А тое, што побач з імі, не хвалюе. Указ дасць магчымасць больш эфектыўна працаваць з прадстаўнікамі бізнесу. Вельмі правільна выказаўся на гэты конт Прэзідэнт. Не павінна быць дзяржавы ў дзяржаве. Павінна быць выразная пазіцыя, што ўсе мы — улада, бізнес — ідзём у адным напрамку. Ад гэтага эфектыўнасць нашай работы толькі павысіцца.

«УКАЗ ДАЗВОЛІЦЬ БОЛЬШ АПЕРАТЫЎНА ВЫРАШАЦЬ ПЫТАННІ, ЯКІЯ ХВАЛЮЮЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА»

Лічыць **старшыня Дрыбінскага райвыканкама Дзмітрый ЧЫГІР.**

«Прэзідэнт на нарадзе па пытаннях удасканалення прававога рэгулявання статусу старшынь выканкамаў базавага ўзроўню агучыў вельмі актуальныя патрабаванні і пасылы, — адзначыў Дзмітрый Чыгір. — На нас сёння ўскладзена вялікая адказнасць за якасць работы ўсіх галін эканомікі, жыцця нашых грамадзян. І ад выразнай работы на месцах залежыць шмат чаго. Указ аб пашырэнні паўнамоцтваў старшынь райвыканкамаў дазволіць больш аператыўна вырашаць пытанні ў фінансавай і эканамічнай сферах, перш за ўсё праблем, якія хвалююць насельніцтва раёна. Прыватны бізнес павінен працаваць з мясцовай уладай плячо ў плячо і ўдзельнічаць у выкананні пастаўленых перад раёнам задач, а тым больш у Год добраўпарадкавання і пяцігодку якасці».

Паводле паведамленняў нашых карэспандэнтаў.

Извещение о проведении электронных торгов по продаже пустующего жилого дома, признанного выморочным наследством и переданного в собственность Дукорского сельского Совета

Дата, время и место проведения аукциона (электронных торгов)	Республика Беларусь, ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа», адрес ЭТП в сети Интернет: https://et.butb.by, **10 марта 2025 г., время проведения устанавливается ОАО «БУТБ» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»**
Организатор торгов, его адрес и телефоны	Дукорский сельский исполнительный комитет, Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский район, аг. Дукора, ул. Речная, д. 14, конт. тел.: +375 17 136 39 35, +375 17 133 16 36, +375 17 133 16 22, **Эл. адрес:** dukorselisp@pukhovichi.gov.by
Адрес и характеристики пустующего жилого дома	**Лот №1:** одноэтажный деревянный одноквартирный жилой дом, расположенный **по адресу: д. Горки, д. 30,** общей площадью 42,0 м². Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома не зарегистрирован в регистре недвижимости
Начальная цена предмета аукциона	1 базовая величина (**42 рубля**)
Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты текущего (расчетного) банковского счета для перечисления денежных средств	100 % от начальной цены (42 руб. 00 копеек). Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в электронных торгах на расчетный счет: № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X. **Получатель платежа:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа», УНП 190542056, код платежа 04805
Возмещение затрат	Расходы на опубликование извещения в СМИ и услуги ЭТП
Начало и окончание приема документов	С даты объявления электронных торгов **по 15.00 05 марта 2025 года**

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», Положением «О порядке продажи без проведения аукционов пустующих жилых домов, организации и проведения аукционов по их продаже», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.09.2021 г. № 547.

Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр предмета торгов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с представителями организатора в рабочее время (понедельник—пятница с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30).

Участниками аукциона (электронных торгов) могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

Порядок проведения и оформление участия в электронных торгах размещен на сайте оператора et.bytb.by.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

подать в Дукорский сельисполком заявление о предоставлении земельного участка.

В течение 10 рабочих дней после совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий сельисполком заключает с ним договор купли-продажи и передает ему копию решения суда о признании пустующего дома выморочным наследством, один экземпляр протокола

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by
Продавец	Частное предприятие «Белтюмет», 225320, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 79А

Предмет электронных торгов – оборудование (б/у). Местонахождение – г. Барановичи, ул. Вильчковского, 79А

№ лота	Наименование	Инв. номер	Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб.
1.	Аппарат воздушно-плазменной резки CUT 100 (R85)	1000013	1263,60
2.	Аппарат воздушно-плазменной резки CUT 160 (J47)	1000017	3693,60
3.	Аппарат пескоструйный ДБС-100	1000020	3888,00
4.	Полуавтомат Midimagster 1801	12	615,60
5.	Сварочный аппарат JASIC ARC315 (R14)	1000015	1026,00
6.	Сварочный аппарат JASIC ARC350 (J99)	1000003	1231,20
7.	Сварочный аппарат JASIC MIG 500 (J91)	1000031	3456,00
8.	Сварочный аппарат JASIC ARC350 (J99)	1000016	1231,20
9.	Аппарат воздушно-плазменной резки Оливер GUT 100 HS	1000020	1263,60
10.	Сварочный аппарат JASIC MIG 200 (J91)	1000004	820,80
11.	Сварочный аппарат JASIC MIG 200 (J91)	1000020	820,80
12.	Вибростол	1000013	307,80

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа — ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгах опубликовано в г. Звязда от 09.01.2025 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **21.02.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **20.02.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

АКЦЭНТ НА ІНАВАЦЫІ

Два інвестпраекты, звязаныя з лесанарыхтоўчай тэхнікай, рэалізоўваюцца «Амкадорам»

З 2022 года ААТ «Амкадор-СЕМАШ» — кіруючая кампанія холдынга», вядучы вытворца тэхнікі для сельскай гаспадаркі, рэалізоўвае два інвестыцыйныя праекты. Падрабязнасці даведаліся на прадпрыемстве.

Першы датычыцца арганізацыі інавацыйнай імпартазамяшчальнай вытворчасці маніпулятараў з інтэлектуальнай сістэмай кіравання для самаходнай лесанарыхтоўчай тэхнікі (харвестараў, форвардараў). Праект уключаны ў Дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады з прыцягненнем сродкаў інавацыйнага фонду Мінскага абласнога выканаўчага камітэта і Беларускага інавацыйнага фонду.

Другі — стварэнне інавацыйнай імпартазамяшчальнай вытворчасці маніпулятараў з інтэлектуальнай сістэмай кіравання для самаходнай лесанарыхтоўчай тэхнікі (харвестараў, форвардараў), уключаны ў пералік перспектыўных імпартазамяшчальных інвестыцыйных праектаў, зацверджаны адпаведным распараджэннем прэм'ер-міністра, з удзелам міждзяржаўнага крэдытнага пагаднення з Расійскай Федэрацыяй.

— У ходзе рэалізацыі гэтых інвестыцыйных праектаў закуплена і ўведзена ў эксплуатацыю больш за 50 адзінак высокатэхналагічнага абсталявання з высокім узроўнем аўтаматызацыі і рабатызацыі. Асобныя віды яго не маюць аналагаў у краіне. Сярод новага абсталявання — прэс лістагібачны, рабатызаваныя зварачныя комплексы, вертыкальныя і гарызантальныя апрацоўчыя цэнтры з ЛПК, комплексная трансфарматарная падстанцыя і многае іншае, — растлумачылі на прадпрыемстве.

Дарэчы, мадэрнізацыя вытворчых плошчаў, тэхналагічнае перааснашчэнне вытворчасці і пашырэнне лінейкі выраблянай прадукцыі дазволяць павялічыць плошчы прадпрыемства і стварыць каля 160 новых працоўных месцаў. А ўкараненне сучасных аўтаматызаваных сістэм не толькі павысіць прадукцыйнасць працы, але і палепшыць якасць прадукцыі, таксама знізіць сабекошт вузлоў, якія тут выпускаюцца.

Варта сказаць, што на сёння ў рамках гэтых двух інвестыцыйных праектаў прадпрыемствам ужо асвоена вытворчасць 12 відаў маніпулятараў для лесанарыхтоўчай тэхнікі і абсталяванне тэлескапічнага пагрузчыка:

— Створаныя магутнасці дазваляюць паставіць на вытворчасць мадэльны рад маніпулятараў, прычэпаў, паўпрычэпаў і навяснога абсталявання для лесанарыхтоўчай тэхнікі і сельскагаспадарчых машын.

Дарэчы, выхад на праектныя магутнасці запланаваны на 2026—2027 гады.

— Рэалізацыя маштабнай праграмы мадэрнізацыі, укараненне перадавых тэхналогій і пашырэнне вытворчых магутнасцяў дазволяць не толькі ўмацаваць пазіцыі холдынга на рынку, але і зрабіць значны ўклад у развіццё айчыннага машынабудавання, — выказалі ўпэўненасць на прадпрыемстве. — У найбліжэйшыя гады «Амкадор» працягне курс на інавацыі, пашырэнне асартыменту і павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, што забяспечыць устойлівы рост кампаніі і далейшую канкурэнтаздольнасць яе прадукцыі.

УЛАСНАЕ АЎТО? ЛЁГКА!

Стартавала новая праграма крэдытавання аўтамабіляў BELGEE ў адным з сістэмаўтваральных банкаў краіны

Як растлумачылі ў СЗАТ «БелДжы», праграма крэдытавання распаўсюджваецца на мадэлі S50, X50, X70, якія набываюцца праз афіцыйных дылераў вытворцы.

Крэдытная прапанова прадугледжвае зніжаную працэнтную стаўку па крэдыце ў ільготны перыяд — 9 % гадавых (стаўка рэфінансавання мінус 0,5 працэнтнага пункта).

У далейшым стаўка будзе роўная 14,5 % гадавых (стаўка рэфінансавання плюс 5 працэнтных пунктаў).

Для мадэлі S50 банк гатовы даць да 90 % кошту аўто з перыядам льготнай стаўкі 3 гады.

Для мадэляў X50, X70 льготны перыяд крэдытавання залежыць ад сумы ўнесеных уласных сродкаў. Калі яна роўная 25—40 % кошту аўтамабіля, то перыяд крэдытавання па зніжанай стаўцы складзе 2 гады, калі ж апладаць самастойна больш за 40 % кошту аўто — ільготны перыяд павялічваецца да 3 гадоў.

Крэдыт даецца на 10 гадоў з магчымасцю датэрміновага пагашэння.

Дарэчы

«БелДжы» прадаў на ўнутраны рынак у студзені больш за 1,3 тысячы аўтамабіляў, паведамляе БелТА.

Як расказаў дырэктар СЗАТ «БелДжы» Генадзь Свідзерскі, студзень — не асабліва актыўны месяц і рэальныя тэндэнцыі продажаў можна будзе ацаніць ужо па выніках лютага. Тым не менш на беларускі рынак у мінулым месяцы было рэалізавана больш за 1,3 тысячы аўто.

Адносна планаў на новыя мадэлі дырэктар не стаў раскрываць дэталі, але адзначыў, што яшчэ адну навінку варта чакаць у продажы па Беларусі ў другім квартале 2025 года.

ДОБРЫ СТАРТ У ПЯЦІГОДКУ ЯКАСЦІ

Цікавая навіна ад МТЗ: 98,01 % адмоў гарантыйнай тэхнікі BELARUS у 2024 годзе было ліквідавана на працягу сутак.

Як паведамілі на прадпрыемстве, цяпер абслугоўванне тэхнікі BELARUS у гарантыйны перыяд эксплуатацыі на тэрыторыі краіны ажыццяўляюць 19 арганізацый. А праект «МТЗ-сэрвіс» — аўтаматызаваная сістэма кіравання сэрвісным абслугоўваннем прадукцыі ААТ МТЗ прызнаны найлепшым на конкурсе «Лідар лічбавай эканомікі 2024» у намінацыі «Рэалізаваны праект года па лічбавай трансфармацыі працэсаў арганізацыі, прадпрыемства».

У тэму

Ці ведаеце вы, колькі запасных частак да трактароў BELARUS вырабляецца на Мінскім трактарным заводзе?

Цяпер ведаеце: у асартыменце — каля 7 тысяч пазіцый. Іншыя вырабляюць прыкладна 4,5 тысячы найменняў, паведамілі на прадпрыемстве.

— У апошнія гады ў сувязі з пацяпленнем клімату наша насельніцтва ўсё часцей вырошчвае таматы і агуркі ў адкрытым грунце. Сёння без цяпліц у Беларусі можна вырошчваць нават перцы і баклажаны, асабліва ў паўднёвых рэгіёнах. Гэта істотна зніжае выдаткі па атрыманні ўраджаю, — адзначае **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ НАН Беларусі па бульбаводстве і агародніцтве Андрэй ЧАЙКОЎСКІ**. — Калі казаць аб змене саставу культур на дачных участках, агароднікі-аматары ўжо цалкам абгрунтавана могуць звярнуць увагу на цукровыя сарты кукурузы, бахчавыя (кавуны, дыні), а таксама на такую нязвыклую пакуль для нашых градак культуру, як цыбуля-парэй (вырошчваць яго лепш праз расаду).

На сваім агародзе я раіў бы мець некалькі сартоў асноўных культур з розных груп спеласці.

НА ШТО ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ?

— Сёння ў крамах насення — айчынная, расійская селекцыя, а таксама заходнееўрапейскія сарты і гібрыды (галандскія, іспанскія і г. д.). Ці варта непрафесіяналу звяртаць увагу на высокаінтэнсіўныя сарты замежнай селекцыі?

— Калі ў агародніка-аматара ёсць фінансавы рэсурс і час, каб дамагчыся аптымальных умоў для росту і развіцця пэўнай культуры, можна выбіраць сарты заходняй селекцыі. Але тут патрэбныя так званыя кантраляваныя ўмовы. Плёнкавыя цяпліцы на паліве, якія, хутчэй за ўсё, ёсць у актыве ў дачніка, — гэта толькі часткова кантраляваныя ўмовы. Гаворку ў гэтым выпадку трэба весці аб зашклёных цяпліцах, якія выкарыстоўваюцца ў прамысловым агародніцтве. Яны дазваляюць вырошчваць айчынныя і замежныя сарты інтэнсіўнага тыпу пры дакладным кантролі мікраклімату, харчавання, асвятлення і г. д. Калі мы бываем на дачным участку час ад часу, пару дзён на тыдзень, лепш выбіраць і для цяпліц, і для адкрытага грунту больш адаптыўныя сарты, устойлівыя да стрэсу. Небывалых ураджаяў яны не даюць, але гарантаваны ўзровень ураджайнасці агароднік атрымае. Для ацэнкі і адбору такіх сартоў створана сістэма Дзяржсартавыпрабавання. Сарты і гібрыды беларускай і замежнай селекцыі праходзяць дзве ступені даследаванняў. Першая — вызначае тыя, што падыходзяць для прысядзібнага агародніцтва: ацэньваюцца іх магчымасці па вызначаным узроўні ўраджайнасці і найлепшыя ўносяцца ў рэестр. Другая ступень — трохгадовыя дасканалыя выпрабаванні: у рэестр для прафесійнага агародніцтва трапляе на парадак менш сартоў. Затое яны вельмі ўстойлівыя, прыдатныя да мясцовых умоў і дазваляюць атрымліваць гарантаваныя высокія ўраджаі.

Пры выбары сартоў і гібрыдаў для свайго агарода я раіў бы арыентавацца на Дзяржаўны рэестр і ў большай ступені — на пералік для прамысловага агародніцтва. З Дзяржрэестрам можна азнаёміцца на сайце Дзяржаўнай камісіі па сортавыпрабаванні. Выдадзены і папяровы варыянт.

«МАГ», «ЗУБРАНЯ», «ПАЧАСТУНАК»

Сярод беларускіх сартоў і гібрыдаў агародніны, якія з'явіліся ў апошнія гады, дачнікам варта звярнуць увагу, у прыватнасці, на новыя сарты капусты белакачаннай, канкрэтызуе селекцыянер:

— У рэестр з 2023 года ўключаны гібрыд капусты «Марана» з высокай устойлівасцю да слізістага бактэрыёзу (гэта хвароба з'явілася ў Беларусі ў сувязі з пацяпленнем клімату). «Марана» мае выдатныя смакавыя якасці і асабліва добрая для квашання. Яшчэ адна распрацоўка ў гэтым кірунку — новы сорт капусты белакачаннай «Варта». Дэгустацыйная адзнака свежай прадукцыі — 4,9 бала. Устойлівая да ўзбуджальнікаў кілы капуснай (распаўсюджанай на прысядзібных участках). А квасіць яе, у адрозненне ад іншых сартоў, можна адразу пасля ўборкі, — кажа Андрэй Чайкоўскі.

Сярод новых сартоў таматаў айчыннай селекцыі варта звярнуць увагу на ўжо ўпадабаны дачнікамі буйнаплодны сорт «Лапа» — гэтыя памідоры спеюць на 3–5 дзён раней за іншыя буйнаплодныя ўзоры. Сорт устойлівы да кладаспарыёзу, фузарыёзу і віруса тытунёвай мазаікі. У 2024 годзе ў Дзяржрэестр быў уключаны куставы тамат «Зубраня».

Калі мы бываем на дачным участку час ад часу, пару дзён на тыдзень, разумней выбіраць і для цяпліц, і для адкрытага грунту больш адаптыўныя сарты, устойлівыя да стрэсу.

Для адкрытага грунту і плёнкавых цяпліц — ранняспелы, з буйнымі пладамі высокіх смакавых якасцяў.

Пры выбары сартоў і гібрыдаў для свайго агарода я раіў бы арыентавацца на Дзяржаўны рэестр і ў большай ступені — на пералік для прамысловага агародніцтва.

Што датычыцца агуркоў, то ўхіл сёння селекцыянеры робяць у бок партэнакарпічных (што не патрабуюць апылення пчоламі) сартоў і гібрыдаў, распавёў навуковец. Салодкім смакам, устойлівасцю да мучністай расы і перонаспарозу адрозніваецца сорт агуркоў для плёнкавых цяпліц «Пачастунак» (яго ўраджайнасць — 15 кг з кв. м). Не мае патрэбы ў апыленні і ўключаны ў 2022 годзе ў Дзяржрэестр гібрыд для адкрытага грунту «Духмяны», скараспелы і ўстойлівы да ўсіх грыбковых захворванняў.

Калі ў агародніка-аматара ёсць фінансавы рэсурс і час, каб дамагчыся аптымальных умоў для росту і развіцця пэўнай культуры, можна выбіраць і сарты заходняй селекцыі. Але тут патрэбныя так званыя кантраляваныя ўмовы...Гаворку ў гэтым выпадку трэба весці аб зашклёных цяпліцах, якія выкарыстоўваюцца ў прамысловым агародніцтве.

Высокую ацэнку агароднікаў-аматараў ужо атрымаў перац салодкі «Маг» — таўстасценны, спее на тыдзень раней аналагаў, прыдатны як для салатаў, так і для закатак замарозкі. У ліку фаварытаў дачнікаў з апошніх распрацовак беларускіх селекцыянераў — буракі сталовыя «Слава», рэпчатая цыбуля «Тутэйшая», кабачок «Бонус». А з не самых звыклых пакуль культур — цыбуля-парэй «Войт» са слабавострым смакам і ўраджайнасцю прыкладна на 10 % вышэй за іншыя сарты.

— На сваім агародзе я раіў бы мець некалькі сартоў асноўных культур з розных груп спеласці, — заўважае Андрэй Чайкоўскі. — Дапусцім, па таматах салатнага кірунку выбіраем тры сарты: ранняга, сярэдняга і позняга паспявання. І гэтак жа — выходзячы з трох тэрмінаў паспявання — выбіраем сарты памідораў для закатак. Тое ж датычыцца агуркоў. Вялікі працэнт іх ураджаю спее адначасова. І тады даводзіцца частку раздаваць, частаваць суседзяў і знаёмых. Лепш раўнамерна размеркаваць ураджай на ўвесь агародны сезон і частаваць сяброў па жаданні, а не па неабходнасці.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Задача ад Першага

Трэба супрацоўнічаць са сваімі людзьмі, а не з французамі і немцамі. У Беларусі ёсць элітнае насенне, выведзены высокаўраджайныя сарты сельскагаспадарчых культур. Мы гатовы дзяліцца.

Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з губернатарам Арлоўскай вобласці Андрэем Клычковым. 9 верасня 2024 года.

Залог высокіх ураджаяў

— Работа па стварэнні канкурэнтных сартоў сельскагаспадарчых культур навукоўцамі праводзіцца на пастаяннай аснове. Вынікова вядзецца селекцыя, а таксама арыгінальнае і элітнае насенняводства каля 40 відаў сельскагаспадарчых раслін, — адзначае **доктар сельскагаспадарчых навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, намеснік дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Эрома УРБАН**. — З 1965 года селекцыянерамі цэнтра створана каля 600 сартоў збожжавых, зернебабовых, кармавых, тэхнічных і крупяных культур. Усе зарэгістраваныя сарты цэнтра маюць высокі ўзровень ураджайнасці: у збожжавых — больш за 100 ц/га, у рапсу і зернебабовых культур — да 50–60 ц/га, у лёну-даўгунцу ўраджайнасць ільнотрасты — на ўзроўні 46–51,0 ц/га, у гібрыдаў цукровых буракоў — 60–75,0 т/га. Усе раяніраваныя айчынныя сарты паспяхова канкуруюць з найлепшымі дасягненнямі замежнай селекцыі.

Большае распаўсюджванне сарты селекцыі НПЦ НАН Беларусі па земляробстве атрымліваюць у краінах СНД. 55 сартоў уключаны ў дзяржаўныя рэестры для выкарыстання ў Расіі (у 37 рэгіёнах) і займаюць увогуле больш за 2 млн гектараў. РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве» мае дагаворы па селекцыі і экалагічным выпрабаванні сартоў сельскагаспадарчых раслін уласнай селекцыі з ФБНДУ «Уладзімірскі НДІСГ», ФДАУ «Бранскі аграрны ўніверсітэт», ФБНДУ «Данскі ЗНДІСГ», ФДБНУ «Нацыянальны цэнтр збожжа імя П. Лук'яненка», ФДБНУ «Ульянаўскі НДІСГ», татарскі НДІСГ, ТАА «АРЕКЕТ РУС», ТАА «Меленский картофель» Бранскай вобласці і інш. Вынікам супрацоўніцтва стала стварэнне сумесных сартоў азімай і яравой пшаніцы, яравога і азімага трыцікале: шэсць сартоў уключаны ў Дзяржаўны рэестр сартоў Беларусі, 13 — у Дзяржрэестр РФ (чатыры сарты яравой пшаніцы, пяць сартоў яравога трыцікале, два сарты азімай пшаніцы, два сарты аўса). Распрацоўваецца праграма Саюзнай дзяржавы па селекцыі сумесных гібрыдаў азімага жыта, цукровых буракоў, рапсу, кукурузы. Адзіналцаць новых сартоў нашай селекцыі праходзяць дзяржаўнае сортавыпрабаванне ў Расіі. У Дзяржрэестр РФ для выкарыстання па Цэнтральным і Паўночна-Заходнім рэгіёне ўключана шэсць сартоў ільну-даўгунцу («Пралеска», «Васілёк», «Ласка», «Левіт-1», «Грант», «Веста»). Штогод суб'ектам гаспадарання Расійскай Федэрацыі па іх заяўках рэалізоўваецца больш за 400 тон насення вышэйшых рэпрадукцый сартоў збожжавых, рапсу і лёну селекцыі РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве», дапушчаных да выкарыстання на тэрыторыі РФ. Вялікай папулярнасцю ў рэгіёнах РФ карыстаюцца сарты азімай пшаніцы «Амелія», «Элегія», «Аўгусціна»; яравой пшаніцы «Дар'я», «Ладдзя»; яравога ячменю «Рэйдар», «Дзева», «Калдун»; яравога рапсу «Нёман», «Гедымін», «Герцаг», гарчыцы белай «Алена»; аўсяніцы трысняговай «Таямніца», райграсу пашавага «Гусляр», аўсяніцы чырвонай «Нежность», фестулоліуму «Удзячны». З 2024 года ў Дзяржаўны рэестр ахоўных сартоў Расійскай Федэрацыі ўключана два сарты пшаніцы мяккай яравой — «Мельница» і «Судьба», створаныя ў РУП «НПЦ НАН Беларусі па земляробстве». На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі атрыманы патэнт на сорт трыцікале яравога «Слова». З 2025 года ў Дзяржаўны рэестр ахоўных сартоў Расійскай Федэрацыі ўключана два беларускія сарты азімай мяккай пшаніцы — «Аўгусціна» і «Элегія». Гібрыды цукровых буракоў беларуска-расійскай селекцыі, створаныя з селекцыянерамі ТАА «СоюзСемСвекла» (Расійская Федэрацыя) і РУП «Доследная станцыя па цукровых бураках», на дадзены момант знаходзяцца на дзяржаўным сортавыпрабаванні. Па насенняводстве збожжавых культур і рапсе вядзецца актыўнае супрацоўніцтва з Бранскай, Смаленскай, Арлоўскай, Курскай, Варонежскай, Уладзімірскай, Ніжагародскай, Ленінградскай абласцямі і іншымі рэгіёнамі РФ. Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве пры наяўнасці зацікаўленасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і фермерскіх гаспадарак рэгіёнаў РФ гатовы забяспечыць пастаўку арыгінальнага і элітнага насення сартоў беларускай селекцыі, дапушчаных да выкарыстання ў дадзеным рэгіёне, у неабходнай колькасці.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«ВІЗІТНАЯ КАРТКА» Ў ЛІЧБАВЫМ ФАРМАЦЕ

У Беларусі выдадзена 2,5 млн сертыфікатаў электроннага лічбавага подпісу

Уладальнікам 2,5-мільённага сертыфіката ЭЛП стаў 25-гадовы індывідуальны прадпрымальнік Яўген Марчанка. Такія сертыфікаты выдаюцца ў Беларусі з 1 ліпеня 2014 года, штодня іх колькасць павялічваецца ў сярэднім на 1,5 тыс. адзінак.

— Раней ЭЛП не карыстаўся, сертыфікат электроннага лічбавага подпісу атрымліваю ўпершыню, — распавёў Яўген Марчанка. — ЭЛП неабходны, каб спрасціць працэдуру падачы падатковай дэкларацыі, формы для аплаты ФСАН, іншых дакументаў. Маючы электронны лічбавы подпіс, усё гэта можна зрабіць аддалена.

Прафесійныя інтарэсы Яўгена — рознічны гандаль і сфера паслуг. А дакладней — кава і кавярні. Ён кажа, што час для прадпрымальніка — адзін з самых каштоўных рэсурсаў, і менавіта ён істотна эканоміцца. Дарэчы, уладальнікам двухмільённага сертыфіката ЭЛП стаў прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце Віктар Кочын.

У Беларусі з развіццём электронных сэрвісаў расце і патрэба ў сродках ЭЛП, якія шырока выкарыстоўваюцца ў сістэмах дакументаабароту, для падачы падатковых дэкларацый, статыстычнай і іншай справаздачнасці ў электронным выглядзе, дазваляюць атрымаць доступ да максімальна шырокага спектра электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур на адзіным партале электронных паслуг, распавёў **першы намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг Андрэй ФІЛІПЕНКА:**

— Калі разглядаць дынаміку попыту на гэтыя паслугі, то ў 2022 годзе іх было аказана 78 млн, а летась — каля 140 млн. Такі рост сведчыць аб запатрабаванасці электроннага фармату разнастайных паслуг. Але на іх прасоўванне ўплывае не толькі тое, што дзяржава развівае свае кампетэнцыі ў лічбавай сферы. Важна, каб свае кампетэнцыі ў гэтай сферы развівалі і спажыўцы гэтых паслуг.

Сёлета плануецца прадаставіць карыстальнікам воблачны электронны лічбавы подпіс. Ён стане зручным інструментам лічбавага ўзаемадзеяння грамадзян і бізнесу з дзяржавай, які не патрабуе дадатковых тэхнічных сродкаў.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

ПА «АДБІТКАХ» ГОЛАСУ

Разумныя машыны аналізуюць не толькі тэмбр, але і эмоцыі, настрой і нават узровень стрэсу

З развіццём тэхналогій штучнага інтэлекту (ШІ) адкрываюцца новыя магчымасці для галасавой біяметрыі і моўнай аналітыкі, гавораць спецыялісты.

Цяпер галасавая біяметрыя актыўна выкарыстоўваецца для ідэнтыфікацыі карыстальнікаў, што не толькі павышае ўзровень бяспекі, але і паляпшае зручнасць выкарыстання розных сэрвісаў. У прыватнасці, галасавыя памочнікі і сістэмы распазнавання гаворкі становяцца ўсё больш папулярнымі ў мабільных дадатках і хатніх устройствах.

Эксперт Тарас Мяняйкін падкрэсліў, што ўзрастае цікавасць бізнесу да галасавой біяметрыі. Многія кампаніі імкнуцца інтэграваць гэтыя тэхналогіі для спрашчэння ўзаемадзеяння з кліентамі і павышэння бяспекі. Напрыклад, банкі ўжо ўжываюць галасавую біяметрыю для пацвярджэння асоб кліентаў пры тэлефонных званках.

Варта заўважыць, што штучны інтэлект з'яўляецца ключавым фактарам у развіцці галасавой біяметрыі і моўнай аналітыкі, забяспечваючы больш высокую дакладнасць у распазнанні і аналізе голасу. Алгарытмы машыннага навучання здольныя апрацоўваць вялікія аб'ёмы даных і адаптавацца да разнастайных галасоў і акцэнтаў, што дазваляе сістэме працаваць у розных умовах.

Сучасныя ШІ-алгарытмы не толькі ідэнтыфікуюць голас, але і аналізуюць эмоцыі, настрой і ўзровень стрэсу карыстальніка. Гэта адкрывае новыя перспектывы для прымянення моўнай аналітыкі ў такіх галінах, як псіхалогія, маркетынг і медыцына.

Напрыклад, у ахове здароўя моўная аналітыка можа дапамагчы ў дыягностыцы захворванняў, звязаных з парушэннямі гаворкі ці эмацыянальным станам пацыента.

У бізнесе моўная аналітыка выкарыстоўваецца для павышэння якасці абслугоўвання кліентаў. ШІ можа аналізаваць узаемадзеянне з кліентамі, выдзяляючы ключавыя моманты і праблемы, што дазваляе кампаніям аператыўна рэагаваць на змены ў перавагах спажыўцоў. У найбліжэйшыя гады чакаецца далейшае развіццё гэтых тэхналогій. Штучны інтэлект працягне эвалюцыяніраваць, забяспечваючы стварэнне больш дакладных і эфектыўных сістэм распазнавання і аналізу гаворкі.

На думку спецыяліста, адным з перспектыўных кірункаў стане інтэграцыя галасавой біяметрыі з іншымі формамі аўтэнтыфікацыі, такімі як Face ID — сканер аб'ёмна-прасторавай формы асобы чалавека і адбіткі пальцаў, што дазволіць стварыць шматслойныя сістэмы бяспекі, якія павышаюць абарону і зручнасць для карыстальнікаў.

Такім чынам, укараненне штучнага інтэлекту робіць будучыню галасавой біяметрыі і моўнай аналітыкі шматабяцальным. Гэтыя тэхналогіі не толькі палепшаць узровень бяспекі і зручнасці, але і адкрыюць новыя магчымасці ў розных сферах — ад аховы здароўя да бізнесу.

Сяргей КУРКАЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов: бывшее в употреблении имущество. Местоположение: Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**Автомобиль MAZ 6501A8-325-000, АО 5542-5, 2013 г. в.**	**32 424,00**
2	**Прицеп MAZ 856103-(010), А 8286 В-5, 2013 г. в.**	**16 296,00**
3	**Прицеп MAZ 856103- (010), А 8287 В-5, 2013 г. в.**	**16 296,00**

Цена снижена на 30 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	**10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 5 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» от 16.01.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 21.02.2025. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.02.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00036** о продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

Продавец: Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Молодечненскому району, Минская обл., г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, 67, тел. 80176751334

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 11.03.2025 в 9.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот №1. Легковой автомобиль SAMAND TU5, год выпуска 2011, VIN-код Y3W2PSMTUBUNS1200, механика, 1,6 л., бензин, легковой специальный седан, передний привод, светло-серый, без дтп., инв. № 01510115. Снят с учета 31.10.2024. Выданы регистрационные знаки для транспортных средств, временно допущенных к участию в дорожном движении: 5HET2378. Местонахождение имущества: Минская обл., г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, 67.

Нач. цена: 3777,38 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 377,73 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 10.03.2025.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: 8(0176)751336, +375445425332 (Нарожник Виктор Рышардович), 80176751311, +375298654795 (Гнилозуб Иван Владимирович).

УНП 390477566

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего государственному предприятию «НИИ Белгипротопгаз» на праве хозяйственного ведения **(Продавец)**

Аукцион состоится 26.02.2025 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4

Лот № 1: GAZ-2705, кузов (рама) № 270500B0488086 X96270500B0711639. Начальная цена с НДС 20 % – 8 100,00 руб.

Местонахождение: г. Минск, ул. Стебенева, 14

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by и на электронной торговой площадке Организатора аукциона gostorg.by

Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9; 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; gostorg.by; e-mail: torgi@ino.by

КАМЯК ЧАРВЕЙ

Што высветліў аўдыт USAID?

Гэты тыдзень, мяркуючы па ўсім, увойдзе ў гісторыю як пачатак разгортвання глабальнага аўдыту агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID). Брудная бялізна амерыканскіх улад уразіла ўвесь свет. Таемнае стала відавочным. Канферансье гэтага маштабнага шоу выкрыццяў стаў найбагацейшы чалавек планеты мільярдэр Ілан Маск, які ў адміністрацыі Дональда Трампа кіруе Дэпартаментам эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання (DOGE). «USAID — гэта камяк чарвей. Варта проста пазбавіцца ад усяго гэтага», — заявіў Маск. Дарэчы, сам амерыканскі прэзідэнт таксама вельмі актыўна далучыўся да кампаніі, у прыватнасці, ён заўважыў, што агенцтвам кіруе «купка радыкальных вар'ятаў». І панеслася — насамрэч высветліліся проста шакавальныя падрабязнасці дзейнасці штатаўскага ведамства (аднак будзем справядлівыя: прынамсі адной з такіх «кантор»).

БРУДНЫЯ ШЧУПАЛЬЦЫ

USAID трэба было б назваць агенцтвам па ўмяшанні ва ўнутраныя справы дзяржаў. Аб гэтым заявіла на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава. Яна назвала жахлівай карціну, якая цяпер адкрываецца ўсяму свету ў сувязі з дзейнасцю USAID. «Як высветлілася, значныя сродкі амерыканскіх пададаткаплацельшчыкаў ішлі не на праекты ў сферы гуманітарнай дапамогі (а менавіта так заяўлялася Вашынгтонам на ўсіх узроўнях). Гэтыя грошы ішлі не толькі на ініцыятывы сумнеўнай каштоўнасці, накшталт пастаноўкі трансгендарнай оперы ў Калумбіі або перасадкі палавых органаў у людзей у іншых краінах, але і літаральна на дэстабілізацыю грамадска-палітычнага становішча ў фокусных дзяржавах — вось літаральна так гэта і фармулявалася. Высветлілася і стала здабыткам сусветнай грамадскасці і прадметам абмеркавання ў самых шырокіх колах у ЗША і за іх межамі, што USAID прама спансіравала так званыя бархатныя рэвалюцыі і пераваротыі, а па сутнасці, змену законнай улады ў краінах постсавецкай прасторы, — адзначыла афіцыйны прадстаўнік МЗС РФ. — Шчупальцы гэтага агенцтва праз сістэму фондаў, грантаў, так званых няўрадавых арганізацый глыбока праніклі і аказвалі сур'ёзнае ўздзеянне на дзяржаўнае кіраванне і эканомікі многіх краін свету. Мы выходзім з таго, што такая структура першапачаткова не павінна была стварацца ні з пункту гледжання прынцыпаў і нормаў міжнародных зносін, ні з пункту гледжання агульначалавечых уяўленняў аб маралі і маральнасці».

Марыя Захарава таксама назвала шокам для ўсіх інфармацыю аб тым, што USAID спансіравала праз гранты CMI, патрабуючы ад іх правядзення палітыкі стратэгічнага маўчання па тых пытаннях, якія былі нявыгадныя адміністрацыі Белага дома: «Таму нейкія тэмы літаральна навязваліся, людзей прымушалі паверыць у нешта, яны з кожнага праса ліліся на аўдыторыю, а нейкія тэмы — найбольш маштабныя і больш важныя для амерыканскага грамадства і пададаткаплацельшчыкаў — наогул не падсвятляліся ў CMI ЗША ці іншых краін».

ПАЧЫМ СЛЁЗЫ АНДЖЭЛІНЫ ДЖАЛІ?

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці не прасоўвала дэмакратыю — яно праводзіла аперацыі па дэстабілізацыі, паведаміў партал DD Geopolitics. «Лукашэнка закрыў дзейнасць USAID у краіне, гарантуючы, што Беларусь не стане яшчэ адной Украінай», — адзначыў рэсурс. Між тым, як стала вядома, з 2011 да 2021 года ЗША разам з «Нацыянальным фондам за дэмакратыю» накіравала на антыдзяржаўную дзейнасць супраць Беларусі больш за 200 мільёнаў долараў. Вашынгтон з рукі кармію экстрэмісцкія CMI, а таксама фінансаваў праграмы падрыхтоўкі радыкалаў для правядзення каляровай рэвалюцыі. USAID і NED, якімі кіравалі ЗША і якія падтрымлівалі заходнія краіны, прыкладалі ўсе намаганні для дэстабілізацыі сітуацыі ў Беларусі, у тым ліку ў 2020 годзе, адзначыў тэлеканал «Першы інфармацыйны».

Пратэсты 2020-га, відавочна, былі спланаваны — USAID выдаткавала 50 млн долараў. Таксама агенцтва

ўдзельнічала ў кампаніях эканамічнага ціску, накіраваных на дзяржаўныя прадпрыемствы Беларусі, выкарыстоўваючы санкцыі, фінансаванне забастовак работнікаў і эканамічны ціск для дэстабілізацыі краіны. Уцечка дакументаў паказала, што Польшча, Літва і ЗША каардынавалі санкцыі і пратэсты.

«Калі раней той, хто шчыльна сядзеў на інфармацыйнай іголцы, прапанаваў USAID (а з гэтай крыніцы у тым ліку спансіраваліся і ўсе нашы экстрэмісцкія інфармацыйныя рэсурсы), мог сказаць, маўляў, усё гэта выдумкі, канспіралогія, метад высмейвання і падвяргання сумневу відавочных тэзісаў, то цяпер такой магчымасці няма. Чаму? Бо фактура абнародуецца самімі ЗША. Там адбываецца сур'ёзнае перакройванне асноў знешняй і ўнутранай палітыкі, — падкрэсліў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр Шпакоўскі ў эфіры «Альфа Радыё». — Арганізацыя захоўвае вельмі шмат брудных таямніц. Паглядзіце, чаго каштавалі ў прамым сэнсе ў доларавым выражэнні кракадзілавы слёзы, якія пралівалі галівудскія зоркі над горам «незалежнай» Украіны. Па-мойму, Анджэліне Джалі кожная слёзка каштавала мільён долараў — ёй заплацілі 20 мільёнаў. Сумы астранамічныя! Вельмі шмат каштавалі праекты, звязаныя з памяншэннем дзетараджэння ў Афрыцы, спансіраванне дзяржаўных пераваротаў. Фінансавалі ўсё, што заўгодна, аж да адкрыта абсурдных і відавочна карупцыйных тэм, як, напрыклад, вывучэнне паводзін грызуноў пасля ўжывання псіхатропных рэчываў і гэтак далей».

ГНІЛАЯ СІСТЭМА

Уся прыкормленая брацыя прыйшла ў рух. Яно і зразумела — скончылася «салодкае жыццё» за кошт грантаў за продаж сваёй краіны (менавіта на гэтым і грунтавалася сістэма). «Мы ўбачылі, што па ўсім свеце пачалі закрывацца нібыта незалежныя CMI, у тым ліку беларускія, якія палівалі брудам уласныя краіны, але пры гэтым расказвалі, што яны незалежныя, што іх чытаюць, слухаюць, данасяць, падтрымліваюць, таму што з'яўляюцца голасам праўды, — заўважыў у эфіры «Альфа Радыё» дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта палітолаг Аляксей Бяляеў. — Практычна ўсе гэтыя канторы перайшлі ў рэжым вельмі ўмеранай прысутнасці і фактычна цалкам знікаюць з медыясферы. Аб чым гэта сведчыць? Аб тым, што гэта была сістэма, якая выбудоўвалася дзесяцігоддзямі, пры якой за замежныя грошы існавалі канторы, якія спрабавалі ўсім казаць аб сваёй незалежнасці. Але і яны раскрылі свой сапраўдны твар. Так ім і трэба».

І яшчэ. Аўдыт высвятляе і факты прамога раскрадання сродкаў. У прыватнасці, у Мінеапаліс збеглыя «асвоілі» грошы на будаўніцтва «Беларускага цэнтра». На ўзвядзенні на рэдкасць пачварнай скрыні з металалому было скрадзена як мінімум 400 тысяч долараў. А ў Літве выявілі нейкі глабальны фонд Рухега, адным з донараў якога якраз і была арганізацыя USAID. У 2021 годзе яны адкрылі ў Вільнюсе філіял, які, мяркуючы па дакументах, займаўся... масавым навучаннем беларускіх праграмістаў. Дык вось, чатыры супрацоўнікі гэтай арганізацыі за год нібыта рыхтавалі па 1500 (!) такіх спецыялістаў. За што атрымлівалі штомесяц па 3900 еўра. У 2022 і 2023 гадах ім налічылі «прэміі» — кожнаму прыкладна па 220 тыс. еўра. Гэта адзін са шматлікіх прыкладаў «райскага» жыцця «чарвякоў», які яскрава адлюстроўвае ўсю гнілую сістэму.

«Мы вельмі добра ведаем, як працуе USAID. Іх гранты не будуюць эканоміку — яны будуюць рэвалюцыі», — падкрэсліў у 2020-м Аляксандр Лукашэнка, кажучы аб пратэстах у нашай краіне пры падтрымцы Захаду. Прэзідэнт Беларусі, як заўсёды, меў рацыю — гэта яскрава пацвярджаюць цяперашнія падзеі вакол USAID.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by
Продавец	ЗАО «АВАНГАРД ЛИЗИНГ», УНП 191257170, 220028 г. Минск, ул. Полтавская, д. 10
Предмет электронных торгов № 1: административно-торговое помещение, инв. номер 610/D-64719, общая площадь 206,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Трусова, 32Б-3. **Дополнительная информация:** аренда	**Начальная цена (с НДС 20 %) – 99 500,00 долл. США***
Предмет электронных торгов № 2: машино-место, инв. номер 500/D-978829738, общая площадь 12,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Макаёнка, 11-763	**Начальная цена (с НДС 20 %) – 4 500,00 долл. США***
Предмет электронных торгов № 3: легковой внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL) BMW X3, бывший в эксплуатации, 2006 г., расположенный по адресу: г. Минск, ул. Полтавская, д. 10	**Начальная цена (с НДС 20 %) – 5 700,00 долл. США***

*Оплата предмета электронных торгов производится в белорусских рублях в сумме, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения платежа

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа — ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: предоплата 100 % в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения аукциона

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота № 1 и **6 %** от цены продажи лотов № 2-3 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **11.03.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **10.03.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

Контактные данные	**Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

ООО «Юридическая компания Аспект»

проводит четвертые повторные публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущественных прав ликвидируемого юридического лица – иностранного унитарного предприятия «Юколанефть»

№ п/п	Наименование лота	Начальная цена без НДС, руб.	Шаг торгов (5 %), руб.	Задаток для участия в торгах (10 %), руб.
1	Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «АРСнефть» (УНП 291047728) на общую сумму 39 876,99 бел. руб.	18 375,31	918,77	1 837,53
2	Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «Фолоуми» (УНП 193120458) на общую сумму 2 745,88 бел. руб.	1 265,30	63,27	126,53

*Торги назначены на **24.02.2025 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **21.02.2025 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

Продавец	**Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»**
Организатор торгов	**ООО «Юридическая компания Аспект»**
Реквизиты для оплаты задатка	**Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** р/с BY23TECN30121503000130000000 в ОАО «ТЕХНОБАНК», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 192140296

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Дебиторская задолженность» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» 27.08.2024 (стр. 6), 22.10.2024 (стр. 14), 13.11.2024 (стр. 12), 22.01.2025 г. (стр. 14)

Дополнительная информация о порядке проведения торгов по телефону +375 (44) 5986627 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомление с документами на лот возможно по месту проведения торгов после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627

ОБЪЯВЛЕНИЕ
об электронных торгах

Государственным предприятием «БелЮрОбеспечение» (192821149) назначено проведение электронных торгов:

Организатор	ООО «Топгранула»
Предмет	Лот № 9.2025.03.00014, комплекс недвижимого имущества вблизи г. п. Россь
Место нахождения	Волковысский район, вблизи г. п. Россь
Начальная стоимость	792 000,00 бел. руб. с НДС

Торги будут проведены 11.03.2025 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by. Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 10.03.2025.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы»

ПАГЛЫБЛЯЦЦА Ў ТАЯМНІЦЫ ЧАСОЎ

Вынікі археалагічных і навуковых даследаванняў стануць адкрытыя для шырокіх колаў грамадства

Розныя этапы гісторыі краіны будуць адлюстраваны ў экспазіцыі новага Нацыянальнага гістарычнага музея, работы па будаўніцтве якога, згодна з адпаведным указам Прэзідэнта, павінны пачацца сёлета. Пакуль гаворка пра праект — мяркуецца, што сам будынак будзе займаць каля 20 тысяч квадратных метраў. Разглядаецца і сімвалічнае ўвасабленне ў прасторы — у выглядзе карты Беларусі. Пра гэта паведаміў дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вадзім ЛАКІЗА.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Акрамя таго, у маі гэтага года ва ўрад збіраюцца ўнесці прапановы па музеефікацыі і развіцці археалагічнага комплексу на рацэ Менцы. Паводле Вадзіма Лакізы, ёсць нават папярэдняя архітэктурна-планіровачная канцэпцыя, што падрыхтавалі архітэктары, грунтуючыся на ідэях даследчыкаў, якія працавалі на археалагічным комплексе на рацэ Менцы — найбуйнейшым у рамках зацверджанай урадам канцэпцыі фарміравання найбольш значных нацыянальных археалагічных праектаў на 2023—2030 гады.

У выніку раскопак выяўлена, што ў горада, які існаваў у X—XI стагоддзях, была абарончая сцяна вышынёй 5-6 метраў з дубовымі канструкцыямі. Пасля таго як яе раскапалі, узнікла неабходнасць яе закансерваваць. Разам з вучонымі пра гэта клапоцяцца ў адной з гомельскіх арганізацый, якая займаецца кансервацыяй. Каардынатарам работы па стварэнні археалагічнага музея пад адкрытым небам выступае Міністэрства культуры Беларусі. Некаторыя артэфакты ўжо можна было ўбачыць у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзе ў Дзень беларускай навукі выстаўляліся рыдлёўка X стагоддзя і драўляныя канструкцыі.

Аднак у працы археолагаў ёсць істотная праблема — чорныя капальнікі. Па словах Вадзіма Лакізы, Нацыянальная акадэмія навук прапануе адзін з радыкальных варыянтаў вырашэння: поўную забарону выкарыстання металадэтэктараў (з магчымасцю іх выкарыстання толькі ў навуковых або спецыяльных мэтах). Па даручэнні ўрада распрацаваны план па супрацьдзеянні незаконнаму пошуку і абароту археалагічных артэфактаў на тэрыторыі Беларусі на 2024—2027 гады, згодна з якім павінен быць створаны механізм закрыцця сайтаў, праз якія прадаюць знойдзеныя аматарамі артэфакты, якія, згодна з законам, з'яўляюцца ўласнасцю дзяржавы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и на право аренды земельных участков с расположенными на них не завершенными строительством незаконсервированными (законсервированными) капитальными строениями 14 марта 2025 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Вид вещного права, целевое назначение земельного участка	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; начальная цена земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1	Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Коммунистическая, 30 424950100001000605	0,0948	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен дом без кровли (фундамент: бутобетон, стены: ГСБ), хозяйственная постройка — (фундамент: бутобетон, стены: кирпич), элементы благоустройства. Общая площадь здания: 189,1 кв. м, хозпостройки: 117,0 кв. м. Готовность: жилой дом 34,10 %, подвал 80 %, хозпостройка 33 %, ограждение 100 %, калитка 100 %, ворота 100 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, связь	1725,05 в том числе: 133,61 — техническая инвентаризация; 181,80 — определение оценочной стоимости; 96,00 — государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 1313,64 — публикации в СМИ	62 975,96 (54 671,48; 8 304,48)	6 300,00
2	Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Зыгмунта Минейко, 47, 424950100001002984	0,1349	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02)	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен фундамент жилого дома (бутобетон, перегородки ФБС). Площадь застройки: 129,0 кв. м. Готовность: жилой дом 10,0 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь	1740,05 в том числе: 133,61 — техническая инвентаризация; 181,80 — определение оценочной стоимости; 111,00 — государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 1313,64 — публикации в СМИ	11 728,02 (3 849,86; 7 878,16)	1 200,00
